# Беларускі Музэй у Ню-Ёрку

- Заснаваны 25 сакавіка 2007 года – у 89-ю гадавіну абвешчаньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Навастораны Беларускі Музэй у Ню-Ёрку адчыніў першую выставу Беларускага сучаснага мастацтва ў ЗША ў будынку Сабора Сьвятога Кірылы Тураўскага, што ў Брукліне.
- Мэта стварэння музэя – захаваньне і папулярызацыя беларускага мастацтва ў ЗША, а таксама дапамога мастакам на Беларусі.
- З дня заснаваньня працуе сайт музэю – belmuseum.org
- За два з паловай гады дзейнасьці Музээм зладжана больш за дзесяць выстаў, у тым ліку ў Вашынгтоне і ў будынку Эўрапарлямэнту ў Таліне (Эстонія).



Сабор Сьв. Кірылы Тураўскага ў Ню-Ёрку

# Першая выстава ў нью-ёркскім Беларускім Музэі

- 25 сакавіка 2007-га году  Беларускі Музэй у Нью-Ёрку адчыніў сваю першую выставу. У выставе паказаны працы вядомых Беларускіх мастакоў.

- Першымі творамі, якія эксапанаваліся Музэем, сталі працы Ўладзіміра Сулкоўскага, Ягора Батальёнка,  Генадзья Драздова, Міхаіла Карпука, Алеся Шатэрніка і Юлі Шатэрнік.

- Усяго 25 сакавіка Музэем было прадстаўлена 34 працы, выкананыя у розных стылях – ад імпрэсіянізма з рэалізмам да абстракцыі і кубізма.



belmuseum.org

# Выстава Міколы Купавы




- 3 чэрвеня 2007-га году адкрылася выстава Міколы Купавы. У выставе паказаны працы вядомых Беларускіх мастакоў.

- Мікола Купава - мастак ярка выражанай беларускай нацыянальнай тэматыкі. У сваёй шматграннай творчасьці мастак увасабляе самыя яркія, значныя постаці беларускай гісторыі і культуры. Ягонаму пэндзлю і разцу належаць такія вобразы як Вялікі полацкі князь Усяслаў Чарадзей, княгіня Рагнеда і князь Ізяслаў, Ефрасіньня Полацкая і Кірыла Тураўскі.

- Асобнае месца ў творчасьці М. Купавы займае распачатая серыя Вялікія князі ВКЛ, а таксама творы, прысьвечаныя Тадэвушу Касьцюшку, Кастусю Каліноўскаму і беларускім песьнярам – Янку Купалу і Якубу Коласу.



**belmuseum.org**


ЯНКА КУПАЛА






BELARUSAN
AUTOCEPHALIC
ORTHODOX CHURCH

# Імпрэза з нагоды 450 – годзьдзя Льва Сапегі




- 19 жніўня 2007 г. адбылася імпрэза з нагоды 450–годзьдзя Льва Сапегі, палітычнага, грамадскага і ваеннага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага. Ён больш за 30 гадоў быў вялікім канцлерам, г. зн. другім чалавекам у дзяржаве пасьля вялікага князя Жыґімонта III.

- Падчас імпрэзы Беларускі музэй прэзэнтаваў мастацкі твор Алеся Шатэрніка з выявай Льва Сапегі, выступалі вядомыя дзеячы беларускага замежжа.





# Выстава Ўладзімера Новака

- 30-га верасьня падчас Беларускага фэстывалю які праводзіўся Сястрынствам і Парахвіяльнай Радай Сабору Святого Кірылы Тураўскага ў Брукліне сумесна з Беларускім Моладзевым Рухам Амэрыкі адбылося адкрыцьцё выставы вядомага ў сьвеце беларускага мастака.
- Мастацтва У.Новака вызначаецца пластычнай выразнасьцю, арыгінальнай кампазыцыяй. Гэта мастак манумэнтальна-дэкаратыўнага жывапісу. Меў шэраг пэрсанальных выставаў у Эўропе, ў прыватнасьці ў Нямеччыне, Баўгарыі, Аўстрыі ды іншых краінах. У Амэрыцы экспанаваўся ўпершыню.
- У музэі былі прадстаўленыя 27-м алеявых карцінаў арыгінальнага мастацтва, якія ахопліваюць больш за сорак год ягонай працы. Адну з сваіх карцін мастак ахвяраваў музэю.












Уладзімер Новак
БЕЛАРУСКІ МУЗЭЙ
Беларускія Матывы









"НАБЕРЭЗЕ
ВОЗЕРА"
70×80



# Выстава Генадзя Драздова

- 25 лістапада 2007 г. БелМузэй адчыніў выставу вядомага ў Беларусі і па-за яе межамі мастака.
- Творы, якія рэпрэзэнтаваліся ў экспазыцыі "Вышэй за хмарачосы" ахоплівалі прыкладна пятнаццацігадовы адрэзак творчасьці мастака. Можна было на ўласныя вочы ўбачыць 19 палотнаў жывапісу, 8 графічных лістоў і 5 абразоў, наваціыйных па тэхніцы выкананьня.
- Падчас імпрэзы аўтар растлумачыў стылістычна-вобразны строй сваіх працаў як трансцэндэнтны сімвалізм. Мастак адзначыў, што гэта спроба асэнсаваць сродкамі выяўленчага мастацтва сёньняшні надзвычай складаны, цікавы і поўны таямніц сусьвет.








**belmuseum.org**

# Выстава Аляксандра Грыгор'ева

- 10-га лютага 2008 г. БелМузэй у Нью-Ёрку адчыніў пэрсанальную выставу беларускага мастака Аляксандра Грыгор'ева.
- У ЗША ён выстаўляўся ўпершыню. На выставу здолеў прывезьці толькі частку сваіх твораў. Два з іх ён ахвяраваў музэю.
- Перад наведвальнікамі выставы выступіў лідэр Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. Ён падкрэсліў важнасць такіх мерапрыемстваў для нацыянальнага адраджэньня. Калі нават тут, на чужбіне, мы сустракаемся з беларускім мастацтвам.
- Для творчасьці Аляксандра Грыгор'ева характэрна алегарычнае мысленне-самабытная мастацкая мова. Асноўнай мелёдыяй палотнаў зьяўляецца вобраз самотнасьці, які падобны да твораў Экзюпэры. Калі больш уважліва прыглядзецца да карцінаў, то пабачым скрытую беларускую ментальнасць. Акрамя жывапісу мастак таксама працуе ў галіне графікі і сцэнаграфіі.








**belmuseum.org**

# Юбілейная выстава : Беларускі Жывапіс і Графіка



- 23 сакавіка, ў 90 гадавіну абвешчаньня Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускі Музэй у Нью-Йорку адчыніў юбілейную выставу Беларускага жывапісу і графікі.
- Роўна год назад быў створаны Беларускі Музэй.
- За гэты час было праведзена 5 мастацкіх выставаў з удзелам знакамітых Беларускіх мастакоў.
- У выставе паказаны працы  Аляксея Марачкіна, Сяргея Цімохава, Яўгена Шатохіна, Міколы Купавы, Уладзімера Новака, Алеся Шатэрніка, Генадзя Драздова,  Рыгора Батальёнка, Анатоля Бараноўскага, Аляксандра Грыгор’ева, Міхаіла Карпука, Зьміцера  Эпштэйна, Юліі Шатэрнік, Канстанціна Селіханава.
- Усяго было прадстаўлена 32 працы выкананыя у розных стылях – ад імпрэсіянізма з рэалізмам да абстракцыі і кубізма.



belmuseum.org






# 'Мастацтва супраць дыктатуры' у Эстонскім Парлямэнце





- 11 чэрвеня ў Эстонскім Парлямэнце адчынілася выстава беларускіх мастакоў 'Мастацтва супраць дыктатуры'.
- Аўтары выставы – гэта не толькі такія знакамітыя беларускія мастакі як Алесь Марачкін і Алесь Шатэрнік, якіх перасьледуюць беларускія ўлады за іхныя перакананьні. Іхныя працы знаходзяцца ў Трэцякоўцы і ў Белым Доме. Гэта і маладыя мастакі, якія таксама думаюць інакш, чым навязвае існуючы беларускі рэжым. Яны хацелі бы не толькі свабоды творчасьці, але і свабоды жыцьця ў гэтай краіне.
- У выставе бяруць удзел працы беларускіх мастакоў Алеся Шатэрніка, Алеся Марачкіна, Юрыя Платонава, Янкі Рамановіча і Юліі Шатэрнік. Усе яны з'яўляюцца ўдзельнікамі творчай групы "Пагоня", вядомай сваёй адданасьцю ідэям дэмакратыі і нацыянальнага адраджэньня Беларусі, за што яе вельмі ня любяць беларускія ўлады.



**belmuseum.org**

- Выстава задумана для прэзентацыі альтэрнатыўнай Беларусі, краіны з глыбокімі гістарычнымі традыцыямі і эўрапейскай культурай, з творчай элітой, якая ня хоча пагадзіцца з ладам рэчаў, які зараз існуе, той Беларусі, якая заўсёды была часткай эўрапейскай культурнай прасторы.

- Выставу адчыніла віцэ-сьпікер Эстонскага парлямэнту спадарыня Крысьціна Оюланд. Яна выказала удзячнасць і падтрымку беларускім дзеячам мастацтва за тое, што яны робяць для захаваньня нацыянальнай культуры Беларусі. У адкрыцьці ўзялі ўдзел вядомы дзеяч культуры Алесь Шатэрнік і палітык Зянон Пазьняк. На адкрыцьцё прыйшлі эстонскія парлямэнтары, грамадскія дзеячы і журналісты.







# Выстава Яўгена Шатохіна

- 16 лістапада 2008 г. адбылося адкрыцьцё выставы вядомага беларускага мастака-графіка Яўгена Шатохіна «Мая і Твая Беларусь».

- Гэта выстава стала першай для беларускага мастака ў Паўночнай Амэрыцы. Яе неведвальнікам Яўген Шатохін прадставіў 24 свае творы, выкананыя алоўкам і акварэльлю на паперы.

- "Схапіўшы" вобраз, Шатохін выяўляе характар і пачуцьці, заглядваючы ва ўнутраны сьвет герояў сваіх твораў, і дэманструе, што зьўляецца сапраўдным майстром алоўка.

- Меў выступ пад час адкрыцьця выставы і старшыня Рады Беларускага Музэю былы дырэктар Беларускага Музэю ў акупаваным Менску адзін з заснавальнікаў Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Антон Шукелойць: *"На Беларусі вызвольны адраджэнскі рух знаходзіўся і знаходзіцца пад вялізным уплывам беларускіх творцаў. Роля людзей мастацтва неаспрэчна вялізная ў вяртаньні беларусаў да беларускасьці".*





На Сомэ. З нізкі "Пэронэ - горад на Сомэ" Афорт, 15,7x22. 2003

**belmuseum.org**



**Ставеку Пэроне.** 2004г. *Акварэль*



**Мой город. 1998 г.** *Акварэль, 40х58*










# ВЫСТАВА АЛЕСЯ ШАТЭРНІКА

- 18 студзеня БелМузэй прадставіў пэрсанальную выставу вядомага беларускага скульптара і мастка  Алеся Шатэрніка "СОНЦАКРЫЖ".
- Алесь Шатэрнік - вядомы як скульптар і жывапісец, зараз яшчэ пачаў пісаць і вершы.
- Бальшыня твораў – краявіды. Хараство беларускай прыроды мастак адлюстроўвае з натуры: падыход, як бы эцюднага кшталту, бо для мастака вельмі істотна выявіць настрой.
- Мастак прадставіў  выдадзеную прад самай паездкай у Амерыку, сваёй кнігі-альбому «Сонцакрыж». Прысутныя мелі магчымасьць праслухаць паэму «Сонцакрыж» у выкананьні аўтара.
- Вялікае мастацтва дае задавальненьне. Гэтая выстава пераканала кожнага з прысутных, хто спраўды любіць і памятае сваю Беларусь, што таго няўлоўнага духу, цеплага, непазнанага, таямнічага, які мы адчувалі на сваёй Радзіме, не знойдзеш у чужых замежных краявідах.








**belmuseum.org**








СОНЦАКРЫЖ

# «Мастацтва супраць дыктатуры» у Вашынгтоне




- 12-га лютага 2009 г. у штаб-кватэры German Marshall Fund of the United States адкрылася выстава беларускіх мастакоў «Мастацтва супраць дыктатуры»

- Перад выставай адбылася дыскусія на тэму сытуацыі ў Беларусі з удзелам прадстаўнікоў беларускай дыяспары, дзеячаў культуры, прадстаўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Вашынгтоне, дзяржаўных структур і няўрадавых арганізацый ЗША.



- Падчас дыскусій удзельнікі абмяняліся меркаваньнямі адносна сытуацыі ў Беларусі. Абмяркоўваліся апошнія зьмены, так званая «лібэралізацыя», палітыка Эўразьвяза ў дачыненьні Беларусі, а таксама тое, якой павінна быць беларуская палітыка ЗША пры новай адміністрацыі ў Белым доме.

- Дыскусію мадэраваў Павол Дэмеш, кіраўнік беларускай праграмы German Marshall Fund, у ёй прынялі ўдзел беларускія мастакі Алесь Шатэрнік і Алесь Марачкін, каардынатар супольнасьці «Трэці Шлях» Павел Марозаў, праваабаронцы Ірына Красоўская і Тацьцяна Процька, япіскап Наваградзкі і Паўночна-Амерыканскі Сьвятаслаў. У дыскусіі таксама ўдзельнічаў першы амбасадар ЗША у Беларусі Дэвід Суорц.



**belmuseum.org**














USAID

# Выстава Алеся Марачкіна




- 15 лютага 2009 г. у БелМузэі адбылося адкрыцьцё выставы Алеся Марачкіна "Мае мары".

- Хоць цэлы шэраг прац творцы на працягу наступнага месяца знаходзіліся ў Вашынгтоне, тыя з беларусаў, што жывуць у Нью-Ёрку, таксама мелі выдатную магчымасьць пабачыць Беларусь вачамі Алеся і адчуць яе подых. Хараство прыроды ды хараство нашых вобразаў выдатна перадаецца аўтарам.



- "Ёсьць прыкметы, якія расказваюць пра ўзровень мастака. І нават па гэтай невялічкай выставе можна зразумець, што ён можа ўсё", - сказаў пра вядомага не толькі на Беларусі, але і ў сьвеце аўтара Зянон Пазьняк, якому мастак вядому яшчэ са студэнцкіх часоў.

- "Дзьве яліны", "Беларуская Джаконда", "Тумановы Вэлюм", "Карсіканская Мадонна", "Заслаўе", "Сьцяна маўчаньня" дэманструюць рознастайнасьць і майстэрства аўтара. Ён здольны перадаць сваімі творамі тое, чым жыве і дыша Беларусь. Сваёй працай Алесь Марачкін спрабуе рабіць тое, што не змаглі зрабіць за 15 гадоў палітыкі - вярнуць беларусаў на шлях беларускасьці.



- Наколькі праца нацыянальнай інтэлігенцыі неабходная і карысная для будучыні Беларусі, напэўна, не разумеем зараз не толькі мы, а, магчыма, час ад часу нават і самі творцы. Не проста ж так палотны Алеся Марачкіна не раз зьнішчаліся ды арыштоўваліся: бо любое беларускае пад антынацыянальным гнётам робіцца забароненым...

- ...Але ж сама ідэя Боская - яна не зьнішчаема. Бо Бог - ёсьць дабро. Рабіць дабро Беларусі і прынесьці дабро на Беларусі - гэта і ёсьць запаветныя мары Алеся "Мары" Марачкіна.

# “Мастацтва супраць дыктатуры” ізноў у Вашынгтоне




- На пачатку красавіка 2009 г. свае памяшканьні для выставы ветліва прапанаваў Фонд амерыканскіх даследванняў (Fund for American Studies) у Вашынгтоне.

- Наведвальнікамі мерапрыемства былі студэнты розных краін, якія навучаюцца ў Амерыцы і супрацоўнічаюць з вышэй названым фондам.

- Былі прадстаўлены творы Алеся Шатэрніка, Алеся Марачкіна, Міколы Купавы, Рыгора Батальёнака, Генадзя Драздова , Юрыя Платонава, Янкі Рамановіча, Елены Тылькінай і Юліі Шатэрнік. Асноўная ідэя выставы "Мастацтва супраць дыктатуры" - гэта данесці праз моц мастацтва ідэю барацьбы за ідэалы Свабоды і Дэмакратыі , супраць дыктатуры, што мае быць ў сенняшнем сьвеце, ў таталітарных краінах.





**belmuseum.org**

















# Выстава Алены Тылькінай “Мары і Думкі”

- 7 чэрвеня Беларускі Музэй у Нью-Ёрку, што месьціцца ў будынку Сабора Сьвятога Кірылы Тураўскага адчыніў пэрсанальную мастацкую выставу “Мары і Думкі” беларускай мастачкі Алены Тылькінай.
- Алена прадставіла свае творы 1979-2009 гадоў.
- Дыплом з адзнакай аб мастацкай адукацыі Алена атрымала ў Беларусі і Расеі. За гады навучаньня Алена працавала ў розных галінах ад алею, акрылу, акварэлі, пастэлі і графікі да фрэскі,  скульптуры і партрэтаў.
- Кожны з яе твораў – гэта філасафічны, сацыяльны і псіхааналітычны нарыс, сучасны і векаісты, эмацыянальна глыбокі і высокапрафісійны. Алена Тылькіна працуе ў розных стылях жывапісу:, сімвалізм, сюррэалізм, рэалізм, графіці і эроціка.








**belmuseum.org**






# Беларускі Музэй у Нью-Ёрку

- Запрашае да супрацоўніцтва партнэраў з Беларусі і прадстаўнікоў Беларускай дыяспары з розных краін сьвету.

- Адрэса БелМузэю:
  401 Atlantic Ave,
  Brooklyn, NY, 11217

- Тэлефоны для сувязі:
  Алесь Вінакураў 646-234-9240,
  718-237-1600, 718-686-1589.

- **Сябры, толькі разам мы зможам зберагчы і павялічыць Беларускую Спадчыну!**

- Жыве Беларусь!



Сабор Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку

**belmuseum.org**